УДК 39-053.2

# Традыцыйная дзіцячая мэбля беларусаў: калыска (другая палова XIX – першая палова XX ст.)

Якубінская А. Дз.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Значную ролю ў далучэнні дзяцей да традыцыйнай культуры адыгрывала дзіцячая мэбля. Калыскі складаюць самую вялікую групу сярод дзіцячай мэблі. Адпаведна традыцыйных уяўленняў беларусаў першым уласным "домам" дзіцяці была "калыска" (рэгіянальныя назвы – "люлька", "зыбка", "калюбель", "калібка"). Калыскі падзяляюцца па способе гушкання на дзве катэгорыі: зыбкі (гушкаліся зверху ўніз) і калыскі (гушкаліся збоку ўбок). Да зыбкі прывязвалася так званая "почапка", цягаючы за якую, зыбку гушкалі. Першапачаткова з'явіліся плеценыя і выдзеўбаныя з калоды, а потым палатняныя калыскі (выкарыстоўваліся для пераносу дзіцяці) і калыскі-скрыні. Калыскі на ножках пачалі ўваходзіць у сялянскі побыт у канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў, іх набывалі на кірмашы або рабілі самі. Дугападобныя ножкі такой калыскі звычайна аббіваліся сукном, каб калыска не стукала па падлозе, калі качалася. Адсюль, напэўна, і назва такой калыскі – *"качанка"("качалка")*. Дзіця клалі ў калыску толькі пасля хрышчэння, бо калыска ў асяроддзі сялян мела вялікі семіятычны сэнс і ўваходзіла ў рытуал першаснага ўключэння дзіцяці ў традыцыйную культуру. Лічылася, што вялікую небяспеку дзіцяці складаюць "начніцы", якія быццам бы не даюць яму спаць. Каб засцерагчы яго ад начніц, маці клала ў калыску грэбень, верацяно, а на Палессі ў якасці полага выкарыстоўвалі старую матчыну спадніцу, якая таксама несла ахоўную функцыю. Беларусы дзіцячую калыску абкурвалі зёлкамі, асвячонымі ў царкве на Успенні. Калі дзіця доўга плакала, раілі пакласці ў ногі ката і гушкаць, і дзіця супакоіцца. Дзіця звычайна спала ў калысцы да таго часу, пакуль у яго праз 1-3 гады не з'яўляўся малодшы брат ці сястра. Тады дзіця (прыкладна ў трохгадовым узросце) клалі спаць "на палок" разам са старэйшымі дзецьмі, ён адначасова служыў месцам для гульняў. Наяўнасць традыцыйнай дзіцячай мэблі, яе канструкцыя, накіраваная на стварэнне прыдатных умоў для сталення дзіцяці, ахоўная функцыя калыскі сведчаць аб існаванні ў беларускай культуры ўстойлівага ўяўлення аб каштоўнасці дзіцячага жыцця, аб асэнсаванні важнасці і адметнасці ў выхаванні першага перыяду дзяцінства. Змена месца ў жыллёвай прасторы (з калыскі на палок) таксама сімвалізавала змену сацыяльнага статусу дзіцяці – пераходу ў новую ўзроставую падгрупу і прынятце яго ў дзіцячую суполку, што суправаджалася з'яўленнем малодшага сіблінга.